View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Праблема гістарызму ў творчасці Максіма Гарэцкага і Віктара Казько

Творчасць кожнага сапраўднага пісьменніка цесна звязана з гісторыяй свайго народа. Вызначальнай стала гістарычная тэма для двух класікаў беларускай літаратуры М. Гарэцкага і В. Казько. Нягледзячы на тое, што пісьменнікаў раздзяляе амаль паўстагоддзя, можна знайсці шмат агульнага як у іх творчасці, так і ў светаўспрыманні. Проза абодвух вызначаецца аўтабіяграфічнай асновай, ужываннем міфавобразаў і міфаматываў, адлюстраваннем страшэнных гістарычных і прыродных катаклізмаў на пачатку і ў канцы XX ст., а таксама глыбокім роздумам аб захаванні духоўнай спадчыны народа і будучым Радзімы. “Гарэцкага на пачатку стагоддзя хвалявала тое, што ў канцы стагоддзя сапраўды абярнулася бядою: абядненне душы, паніжэнне духоўнага патэнцыялу асобы, касмапалітызацыя нацыянальнага быцця. Пісьменнік здолеў супрацьпаставіць рацыяналізму XX ст. стваральную, прадбачлівую сілу мары, так званаму тэхнічнаму прагрэсу – увагу да ўсяго жывога, арганічна-прыроднага” [13, с. 23].

М. Гарэцкі любіў сваю Бацькаўшчыну, ганарыўся яе гісторыяй, да якой звяртаўся ў многіх творах. Менавіта таму пісьменніка называюць адным з пачынальнікаў гістарычнага жанру ў беларускай літаратуры. Нават самыя раннія апавяданні празаіка “У лазні”, “Роднае карэнне” і інш. закранаюць праблемы маруднага працэсу духоўнага абнаўлення, адсталасці беларусаў у сваім нацыянальным развіцці ад суседніх народаў. “Час ідзе – угары, у воздусі лётаюць аэрапланы, дырыжаблі, пад вадой жывуць людзі, як на зямлі; перагаворваюцца на тысячы вёрст; даходзяць да таго, што думаюць замаражываць чалавека на колькі трэба часу і ўзноў ажыўляць яго; усё ідзе шпарка ўперад, толькі нашу вёску, як абросшы мохам камень каля шляху, з месца не скранеш...” [2, с. 59].

Далёкая мінуўшчына Беларусі адлюстравана Гарэцкім у апавяданнях “Мірныя спевы”, “Князёўна”, “Войт”, “Прысяга”, “Досвіткі”, “Страшная музыкава песня” і інш. “Пісьменнік разглядаў гісторыю не як стыхію, не як сукупнасць падзей, звязаных храналагічна, а як складаны працэс, які падпарадкоўваецца сваім законам і заканамернасцям. Народ – творца самой гісторыі, яе суб’ект. Для М. Гарэцкага народ і гісторыя непадзельныя, асабліва на Беларусі, дзе гістарычная памяць захавалася пераважна ў легендах, дзе навука многае страціла, пра многае забылася”[1, с. 106]. Адметнасць гэтых твораў у тым, што ў іх пісьменнік імкнуўся ўзнавіць паўсядзённасць мінуўшчыны ў найбольш драматычных і нават трагічных для асобы праявах.

У аповесці “Ціхая плынь”, якая ствaралася на працягу 13 гадоў (з 1917 да 1930), М. Гарэцкі раскрыў панараму жыцця звычайнай беларускай вёскі на пачатку XX ст., у трагічным лёсе якой увасоблена ўся шматпакутная Беларусь. Пісьменнік адлюстраваў увесь цяжар становішча беларускіх сялян, для якіх “доля аднолькава”: аднолькава безвыходная. “Гу-гу-гу… Мама!...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Безвыходнасць цяжкая і пакора лёсу апошняя, крайняя – чуецца ў тым плачы, у тым восеньскім дажджы, у той музыцы бяссільнага. Гэта ўжо не плач – гэта песня роспачы… І навучаюцца той песні ў забытым краі яшчэ пад сэрцам матак. Яна снуецца тут вякамі!” [3, с. 134]. Аўтар падводзіць чытача да думкі, што ўсё “жыццё беларусаў – “гэта песня роспачы”, якую маткі з калысак співаюць сваім дзецям. Праз праўду жыцця вёскі Асмолава Максім Гарэцкі паказаў балючую праўду жыцця Беларусі: народ прызвычаіўся, жыве, пакуль жывецца. Ён застыў у “ціхай плыні” існавання, а ў тых, хто жадаў парушыць яе, яшчэ не хапала сіл для барацьбы, але ў душы ўжо наспявала, няхай кволае, але непрыманне, пакуль што “Хомкава” [4, с. 83]. Такім чынам, пісьменнік сцвярджае, што кожны чалавек з’яўляецца творцам не толькі ўласнага жыцця, але і самой гісторыі.

Цалкам заканамерным быў зварот М. Гарэцкага да ваеннай тэмы: ён прымаў асабісты ўдзел у першай сусветнай вайне, вынікам чаго сталі дакументальна-мастацкая кніга “На імперыялістычнай вайне”, апавяданні “Літоўскі хутарок”, “Генерал”, “Рускі” і інш. У гэтых творах “істотна змяніўся аўтарскі погляд на жыццё, інакшай стала мастакоўская канцэпцыя чалавека. Герой аказваецца непасрэднай ці ўскоснай ахвярай вайны. Выразная антымілітарысцкая скіраванасць твораў М. Гарэцкага павінна быць пастаўлена ў заслугу аўтару, які на аснове творчага ўспрымання лепшых дасягненняў класічнай літаратуры (“Севастопольские рассказы” Л. Талстога і інш.) выпрацоўваў плённую традыцыю нацыянальнай мастацкай прозы, традыцыю непрымання вайны як вялікай усенароднай трагедыі” [7, с. 227 – 228].

Новыя старонкі гісторыі былі раскрыты Гарэцкім у рамане-хроніцы “Віленскія камунары”: рэвалюцыйны рух на Беларусі і ў Літве, звязаны з паўстаннем віленскіх камунараў 1918 – 1919 гг. і ўсталяваннем савецкай улады ў Вільні. “Гэта была апошняя спроба пісьменніка аддаць належнае гераічным намаганням беларускай інтэлігенцыі ў справе духоўнага Адраджэння краю” [11, с. 22]. Максім Гарэцкі разумеў, што зварот да гістарычных карэнняў моцна спрыяе абуджэнню і росту нацыянальнай самасвядомасці чалавека, яго духоўнаму сталенню. Таму вялікую ролю ў справе нацыянальнага адраджэння Бацькаўшчыны надаваў гісторыі краіны.

Больш глыбокае адлюстраванне праблемы беларускай вёскі, адносінаў да зямлі, суладдзя чалавека і прыроды, нацыянальнага і духоўнага адраджэння ўжо на мяжы XX – XXI стст. знайшлі ў творчасці В. Казько. Гэта – адзін з самых яркіх сучасных беларускіх пісьменнікаў, які з самага пачатку свайго творчага шляху імкнуўся гістарычна асэнсаваць не толькі лёс свайго народа, а і ўсяго чалавецтва. “Плённа развіваючы нацыянальныя мастацкія традыцыі, звяртаючыся да ўмоўных формаў, празаік стварае сапраўдную канцэпцыю ў адлюстраванні беларускага менталітэту, раскрывае сутнасныя рысы нацыянальнага характару. А шлях спасціжэння саміх сябе, сваёй асабістасці і ёсць шлях да духоўнасці, да храма” [ 12, с. 58].

Творчасць В. Казько цесна пераплецена з яго жыццём, ён ішоў у



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

літаратуру ад асабістай біяграфіі, асабістых уражанняў і жыццёвага вопыту. Нарадзіўся напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, у трохгадовым узросце ад выбуху бомбы згубіў маці і сястру. Застаўшыся сіратою, хлопчык зведаў дзіцячыя дамы на Палессі, Заходнюю Сібір, вучобу ў горным індустрыяльным тэхнікуме, цяжкую шахцёрскую працу і рамантыку геолагаразведкі. Трагічныя ўспаміны з ваеннага дзяцінства былі яшчэ больш азмрочаны тужлівымі адчуваннямі адарванасці юнака ад роднай зямлі. Толькі на чацвёртым дзесятку жыцця ён вярнуўся на Беларусь. Гады вялікіх перападаў і ўзрушэнняў сярэдзіны і канца мінулага стагоддзя адчувальна адбіліся на творчасці В. Казько.

Ужо ў самых першых аповесцях празаік выявіў яркую творчую індывідуальнасць. Знаходзячыся пад уплывам так званай міфалагічнай школы, якую прадстаўлялі Ч. Айтматаў, В. Астаф'еў, А. Жук і іншыя, В. Казько шырока выкарыстоўвае міфы, легенды, біблейскіе матывы і сюжэты, якія дапамагаюць глыбей выявіць часавую аўтарскую канцэпцыю. "Умоўнасць – адзін са сродкаў "злучэння часу", калі гістарычны і пазагістарычны вопыт народа ўваходзіць у сучаснасць, дапамагаючы яе асэнсаванню. Разам з тым героі В. Казько, апынуўшыся ў фантастычным свеце, дзе нішто іх не абмяжоўвае, раскрываюць свае сапраўдныя якасці і тыя патаемныя думкі, якія не дазваляюць жыць "спакойна" [ 12, с. 48].

Напрыклад, у аповесці "Высакосны год" фантасмагарычная сцэна з паўстаўшымі з магіл нябожчыкамі, ахвярамі вайны, сярод якіх маці і сястрычка Дзімы Прыгоды, як бы вяртае час назад і тым самым аблягчае душу героя, здымаючы з яе ўвесь цяжар віны за злачынствы іншых, за тое, што ён застаўся жывы. У новым творы "Аповесці аб беспрытульным каханні" зноў у цэнтры праблема памяці, якая абвастрае душэўныя пакуты галоўнага героя Андрэя Разоркі. Умоўныя сны-мроі дазваляюць аўтару выявіць глыбокі кантраст паміж прыдуманым светам і жорсткай ваеннай рэчаіснасцю. Страшэннае, бесчалавечнае мінулае ў аповесці ўвасабляецца і ў сімвалічны вобраз чорнага сабакі-здані, які мроіцца герою.

І нарэшце, у аповесці "Суд у Слабадзе", якая завяршае цыкл твораў пра вайну, рэальнасць зноў трансфармуецца ў фантасмагорыю. Найперш гэта выяў- лена ў знішчэнні натуральнай палярнасці на колеравым узроўні. Калі традыцыйна чорнае сімвалізавала смерць, а белае – жыццё, то пасля ўсіх жудасаў, што перанёс Коля Лецечка ў фашысцкім "кіндэрхайме", для яго і чорнае, і белае сімвалізуюць смерць, жахі вайны. Пісьменнік паказаў, што менавіта вайна знішчыла гэту палярызацыю, бо эсэсавец у чорнай форме і доктар у белым халаце адбіралі ў дзяцей жыццё. Асаблівае напружанне выклікае карціна страшнага падарожжа хлопчыка па шляху, што ўсланы чалавечымі целамі, якая канцэнтруе ў сабе ўсе жахі вайны. На думку М. Тычыны, "герой аповесці "Суд у Слабадзе" нагадвае міфічнага Іова: ён таксама абраны лёсам – Лецечку выпала выпрабаванне памяццю аб перажытым у гады вайны…" [9, с. 85]. Такім чынам, у сваіх першых аповесцях В. Казько паказаў, што вайна, звярыная сутнасць фашызму

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

знішчаюць у чалавеку ўсё самае лепшае – памяць, права на будучыню, на працяг свайго роду.

У 80 – 90-я гады пісьменнік засяроджвае сваю ўвагу на глабальных праблемах сучаснага свету – экалагічных, эканамічных і духоўнага заняпаду грамадства. Як адзначыў М. Тычына, “В. Казько адзін з тых, хто ў ліку першых зафіксаваў у нашай літаратуры жахлівы працэс абмялення, “меліярацыі” чалавечай душы, калі чалавек перастае быць чалавекам, а беларус – беларусам” [10, с 18].

Мяняецца і галоўны герой твораў В. Казько. Па вызначэнні Т. Нуждіной “Гэта селянін-паляшук, які зведаў на сабе ўплыў, уздзеянне духоўнага і экала- гічнага Чарнобыля… Ні коласаўскія, ні мележаўскія героі яшчэ не сутыкаліся з такім дзікім, жорсткім замахам чалавека, грамадства, дзяржавы на саму прыроду, на святая святых – ваду, паветра, лес…На саму аснову жыцця беларуса”  [8, с. 194].

У наступных творах: раманах “Неруш”, “Хроніка дзетдомаўскага саду”, “Бунт незапатрабаванага праху”, аповесцях “Цвіце на Палессі груша”, “Выратуй і памілуй нас, чорны бусел” і іншых пісьменнік выступае не толькі за чысціню палескай прыроды, але і за чысціню чалавечых адносін, маральных ідэалаў. Гібель прыроды, варварскія адносіны да яе знішчаюць чалавечае ў самім чалавеку. Чалавек перастаў быць гаспадаром на сваёй зямлі, і гэта самае страшнае.

Раман “Неруш” – гэта раман-папярэджанне, які паказвае, да чаго можа прывесці нядбайнае абыходжанне з роднай зямлёй. В. Казько пераконвае, што не ўсякае пераўтварэнне прыроды застаецца беспакараным для чалавека, нават калі гэта пераўтварэнне з’яўляецца неабходным, карысным з пункту гледжання сучаснасці. Меліярацыя на Палессі, напрыклад, у першыя гады яе ажыццяўлення прывяла да нябачна высокіх ураджаяў. Так, у рамане апісваецца, як “зерне не паспявалі адвозіць ад камбайнаў, яго не было куды ссыпаць, не хапала такоў, павецяў, яго не паспявалі лапаціць і сушыць на сушылках” [5,с.295]. Разам з тым меліярацыя мела і выдаткі. Непрадуманае ўмяшанне чалавека ў прыродныя працэсы прывяло да таго, што ў многіх месцах Палесся амаль цалкам знік лес. Так, у Княжборы, дзе адбываюцца падзеі, за адну вясну, за адно лета знікла ўсё: высяклі дубы, а прапалі і грыбы. У бядотным становішчы апынуліся звяры і птушкі. Палескія буслы вымушаны былі пакінуць свае родныя месцы. Вынік аказваецца больш супярэчлівым, чым яго чакалі.

Тэма гістарычнага лёсу народа і чалавецтва з’яўляецца скразной у рамане В. Казько “Хроніка дзетдомаўскага саду”. У творы асэнсоўваюцца падзеі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, падзелу Беларусі на Усходнюю і Заходнюю, сталінскія рэпрэсіі і вымiранне традыцыйнай вёскі. Розныя часы ў рамане звязваюцца ў адзінае цэлае праз сімвалічны вобраз саду, бо ўсе героі маюць прамое дачыненне да яго лёсу і сваімі адносінамі да саду выяўляюць сапраўдныя ці ўяўныя каштоўнасці, узровень сваёй духоўнасці альбо маральнай дэградацыі. Для Трахіма Трубяцкога, які пасадзіў сад – гэта

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

найвялікшая каштоўнасць, якая пераходзіць нашчадкам, звязвае пакаленні і дае веру ў будучыню. Сад збліжае людзей духоўна блізкіх. Але для прагматыкаў і спажыцоў, такіх як Сідар Місцюк, сад не ўяўляе ніякай каштоўнасці. Таму, як некалі фашысты ў час вайны, ён яго знішчае ў наш час. Твор прасякнуты адчуваннем катастрофы як прыроднай, так і духоўнай. “Фантастычнае падарожжа зубра Сноўдалы ў часе, па розных эпохах – гэта пошукі страчанай некалі гармоніі ў свеце. Зубр увасобіў прыроду не толькі як матэрыяльную каштоўнасць, але і духоўную [12, с. 54]. У рамане легендарна-фан- тастычны вобраз зубра Сноўдалы становіцца сімвалам раўнапраўя і агульнасці прыроды і чалавека.

Асэнсаванню чарнобыльскай катастрофы, эканамічнага і духоўнага крызі- су сучаснага грамадства прысвечана аповесць В. Казько “Выратуй і памілуй нас, чорны бусел”. У гэтым творы пісьменнік бачыць чарнобыльскую трагедыю як заканамерны працяг меліярацыі. Пры ўсім вонкавым падабенстве з Палессем у рамане “Неруш”, у новай аповесці яно паўстае зусім іншым. Перад намі – змрочныя малюнкі паслячарнобыльскага краю: “Чацвёртая чорная чарнобыльская вясна. Прыдурвалася прырода, дурыла сонца, дурылі вятры, сухавейныя і таксама чорныя, што дзьмулі, хавалі ўсё жывое дваццаць чатыры гадзіны ў суткі няспынна. Увесь чарназём, усе тарфянікі пайшлі ў неба. Ралля спавіта саванам цяжкага белага пяску” [6, с.69]. Да буры далучыліся пажары. Усё наваколле запоўніў чарнобыльскі дым, які пазначыў зямлю, хаты, расліны, жывёл цэзіем і стронцыем. Чарнобыль знішчыў на палескай зямлі ўсё, што не паспелі знішчыць меліяратары. Даследчыца Т. Нуждзіна вызначыла твор В. Казько як “горкі рэквіем страчанаму раю, загубленаму народу, які аказаўся заложнікам сваёй неразумнай дзейнасці, панібрацкага абыходжання з атамам” [8, с. 197].

Раман “Бунт незапатрабаванага праху” працягвае цыкл апакаліптычных твораў пра лёс сучаснай цывілізацыі. Аднак у “Эпілогу” аўтар дае магчымасць людзям яшчэ раз аднавіць сваё жыццё на забруджаных Чарнобылем тэрыторыях. Гэты прыём дазваляе пісьменніку акцэнтаваць увагу на тым, што не ўсё яшчэ страчана і ёсць надзея на адраджэнне цывілізацыі.

Такім чынам, і праз сто гадоў, на пачатку XXI ст. праблемы, узнятыя М. Гарэцкім, не згубілі сваёй актуальнасці. Прадаўжальнік яго традыцый В. Казько сваімі творамі сцвярджае, што чалавек да таго часу застаецца чалавекам, пакуль можа пераадолець уласны боль і пакуты, пакуль не страціць здольнасць змагацца за адвечнае, адчуваць сябе асобай, пакуль захоўвае сувязь са спадчынай, фальклорам, традыцыямі жыцця і мыслення сваіх продкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура

1. Вабішчэвіч, В. “І вечнасць варушыцца ў маёй істоце…” Максім Гарэцкі і гісторыя / В. Вабішчэвіч // Роднае слова. – 1994. – № 7 – 8. –

С. 103 – 107.
2. Гарэцкі, М. Збор твораў. У 4 т. Т.1. Апавяданні / М. Гарэцкі. – Мінск: Маст. літ., 1984. – 446 с.
3. Гарэцкі, М. Збор твораў. У 4 т. Т.2. Аповесці. Драматычныя абразкі / М. Гарэцкі. – Мінск: Маст. літ., 1985. – 416 с.
4. Губская, В. Беларуская гісторыя ў аповесці Максіма Гарэцкага “Ціхая плынь” / В. Губская // Роднае слова. – 2003. – №2. – С. 82 – 83.
5. Казько, В. Неруш: Раман / В. Казько. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 225с.
6. Казько, В. Выратуй і памілуй нас, чорны бусел: Аповесці, апавяданні, эсэ / В. Казько. – Мінск: Маст. літ., 1993. – С. 4 – 148.
7. Мушынскі, М. Максім Гарэцкі: перыяды творчасці / М. Мушынскі // Полымя. – 1998. – №5. – С. 219 – 237.
8. Нуждзіна, Т. Загадка Віктара Казько / Т. Нуждзіна // Полымя. – 1999. – №2. – С. 192 – 206.
9. Тычына, М. А. Час прозы: Літ.-крыт. арт. / М. А. Тычына. – Мінск: Маст. літ., 1988. – 205 с.
10. Тычына, М. А. Карані і крона: Фальклор і нацыянальная спецыфіка літаратуры / М. А. Тычына. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 208 с.
11. Тычына, М. На выспе Патмас. Творчасць Максіма Гарэцкага / М. Тычына // Роднае слова. – 1993. – №2. – С. 15 – 23.
12. Ханеня, С. І. Творчасць В. Казько на ўроках літаратуры ў XI класе / С. І. Ханеня // Беларуская мова і літаратура. – 2003. – №2. – С. 47 – 59.
13. Шамякіна, Т. Таямніцы жыцця. Роздум над апавяданнем Максіма Гарэцкага “Роднае карэнне” / Т. Шамякіна // Роднае слова. – 1993. – №2. – С. 23 – 28.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ